**СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!**

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | IV квартал |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 |

*Заставайцеся з намі!*



WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

17 ВЕРАСНЯ 2010 г. ПЯТНІЦА № 182 (26790)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.


Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «НАСТУПНАЯ ПЯЦІГОДКА ПАВІННА СТАЦЬ ПЕРЫЯДАМ АБНАЎЛЕННЯ І ЯКАСНА НОВАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ»

**Наступная пяцігодка павінна стаць перыядам абнаўлення, нацэленым на якасна новае развіццё Беларусі. Аб гэтым заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на шостым з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на чацвёртым Усебеларускім народным сходзе трэба будзе зацвердзіць Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2011—2015 гады. «Ужо стала палітычнай традыцыяй, што гэты глабальны дакумент, які прадвызначае далейшыя перспектывы дзяржавы, прымаецца не ў чыіх-небудзь кабінетах, няхай нават самых высокіх, а непасрэдна народам у асобе прадстаўнікоў, якім людзі давяраюць такія паўнамоцтвы», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама дадаў, што зусім хутка праект праграмы будзе прадстаўлены на ўсеагульнае абмеркаванне, і кожны грамадзянін краіны зможа прыняць удзел у вызначэнні стратэгіі развіцця Беларусі на бліжэйшыя пяць гадоў. Прэзідэнт перакананы, што якім бы маштабным не быў дакумент, ісці ён павінен ад жыцця.



Фота БЕЛТА.



«Думаю, гэта і ёсць нагляднае пацвярджэнне праяўлення ўлады народа. Не якаянебудзь дэмагогія, а такія вось канкрэтныя прыклады, якія даюць магчымасць любому грамадзяніну ажыццяўляць кіраванне дзяржавай», — лічыць Прэзідэнт.

Ён не стаў дэталізаваць змест праграмы, аднак заўважыў, што яна вельмі напружаная і дынамічная. «Інакш і не можа быць, калі мы паставілі за мэту стварыць абноўленае аблічча Беларусі», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што цяперашні з'езд прафсаюзаў — гэта не проста падвядзенне вынікаў і выпрацоўка перспектыў работы федэрацыі, але і важная падзея ў жыцці ўсяго грамадства, паколькі прафсаюзы прадстаўляюць інтарэсы абсалютнай большасці працоўнага насельніцтва краіны. Ён таксама лічыць глыбока сімвалічным, што прафсаюзныя з'езды апошняе дзесяцігоддзе праходзяць напярэдадні пяцігодак, калі распрацоўваюцца і шырока абмяркоўваюцца перспектыўныя планы і асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. «Гэта само па сабе надае нашым форумам асаблівую значнасць, прадастаўляючы магчымасць уносіць свой канкрэтны ўклад у вызначэнне шляхоў развіцця дзяржавы і павышэння дабрабыту народа», — сказаў Прэзідэнт.

### Найважнейшая задача прафсаюзаў — сфарміраваць у працоўных калектывах атмасферу партнёрства, а не канфрантацыі

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, галоўная работа прафсаюзаў — у працоўных калектывах. «І ў перыяд эканамічных цяжкасцяў, і пры мадэрнізацыі калектыў у любым выпадку ліхаманіць. У першым выпадку — ад праблем, у другім — ад неразумення сваёй будучыні пасля абнаўлення вытворчасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Менавіта таму прафсаюзы павінны забяспечваць баланс інтарэсаў. «Людзі павінны ведаць перспектывы як сваіх галін і прадпрыемстваў, так і свае асабістыя, сваё месца на гэтым прадпрыемстве. Павінен быць забяспечаны пастаянны дыялог паміж наймальнікам і работнікамі. І гэта таксама прафсаюзная справа», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

### У бліжэйшы час будзе прапрацавана пытанне аб магчымасці пераразліку пенсій, перш за ўсё самых нізкіх

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што асаблівым клопатам дзяржавы з'яўляецца падтрымка пенсіянераў, якія складаюць больш за чвэрць насельніцтва краіны. Для большасці з іх пенсія — адзіная крыніца даходаў. «І мы па меры росту заработнай платы будзем яе павышаць. Ужо ў бліжэйшы час прапрацуем пытанне аб магчымасці правядзення пераразліку пенсій, перш за ўсё самых нізкіх», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што дзяржава паклапоціцца і пра сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, якія не пераклалі адказнасці за іх на плечы дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, прадпрыемствы павінны больш дапамагаць сваім пенсіянерам і ветэранам. «Усе любяць параўноўваць нашы пенсіі з заходнімі. Але там вялікую частку пенсійнага даходу складаюць карпаратыўныя пенсіі, — падкрэсліў ён. — Таму, калі ёсць магчымасць, уключайце адпаведныя палажэнні ў калектыўныя дагаворы, удзельнічайце ў праграмах дадатковага страхавання».

### У Беларусі ў бліжэйшы час не пойдуць на павелічэнне пенсійнага ўзросту

Кіраўнік дзяржавы чарговы раз заявіў, што павялічваць пенсійны ўзрост у краіне не плануецца: «Нам не трэба ўзнімаць пенсійны ўзрост, таму што нашы пенсіянеры, калі ёсць магчымасць, усё роўна працуюць. Тут мы павінны іх падтрымаць. Няхай працуюць, калі хочуць. Паўстае другое пытанне: ён пенсію атрымлівае і заработную плату». Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што пенсіі ў краіне зусім невысокія. «Дык навошта ламаць коп'і?» — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Калі людзі хочуць працаваць — няхай працуюць, гэта ж нядрэнная прыбаўка да пенсіі, і гэта трэба падтрымліваць, сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы заявіў аб тым, што ўсе размовы аб павелічэнні пенсійнага ўзросту трэба раз і назаўсёды забыць, і запэўніў, што ў бліжэйшы час у Беларусі не пойдуць на павелічэнне пенсійнага ўзросту.

Дзяржава пакуль можа гэта вытрымаць. Калі будзе цяжка, будуць зняты іншыя праграмы і праекты, але пенсійны фонд заўсёды будзе забяспечаны, — заявіў Прэзідэнт.

### Сістэма аказання матэрыяльнай дапамогі беспрацоўным будзе зменена

«Мы падтрымаем матэрыяльна грамадзян, якія часова аказаліся без работы. Але гэту кантору будзем «сціскаць», так званыя дапамогі па беспрацоўі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён растлумачыў гэта тым, што цяпер у Беларусі колькасць вакансій большая, чым колькасць беспрацоўных.

«Таму ідзіце працуйце», — сказаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што сёння ёсць пэўныя грамадзяне, якім выгадна «сядзець на дапамозе». «Мы гэта ўсё бачым і памаленьку гэту кантору будзем «сціскаць». Мы будзем падтрымліваць тых, хто трапіў у складаную сітуацыю і не можа на працягу нейкага часу працаўладкавацца. І ў гэтым напрамку і Міністэрству працы і сацыяльнай абароны, і ўраду давядзецца папрацаваць у бліжэйшы час», — падкрэсліў Прэзідэнт.

### Неабходна ажыццявіць комплекс дзейсных мераў па матэрыяльнай і маральнай падтрымцы сям'і

«Сфера адказнасці прафсаюза — не толькі работнік, але і яго сям'я, таму што плённа можна працаваць толькі ў тым выпадку, калі ведаеш: дома ўсё ў парадку», — сказаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што дзяржава ніколі не эканоміла на сям'і. Аб гэтым сведчаць і факты. У прыватнасці, цяпер сістэма дапамог распаўсюджваецца прыкладна на паўмільёна дзяцей, амаль 45 тыс. дзяцей ва ўзросце да 2-х гадоў забяспечаны бясплатным харчаваннем, адрасную дапамогу атрымліваюць больш як 19 тыс. сем'яў з дзецьмі. «Ніводная дзяржава, нават самая багатая, не можа сабе такога дазволіць», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўсё гэта садзейнічала пэўнай стабілізацыі дэмаграфічнай сітуацыі. Але, як лічыць Аляксандр Лукашэнка, супакойвацца рана і трэба ісці далей: рэалізаваць комплекс дзейсных мераў па матэрыяльнай і маральнай падтрымцы сем'яў.

Прэзідэнт запатрабаваў таксама асаблівую ўвагу ўдзяліць праблеме сацыяльнага сіроцтва. Паводле яго слоў, за апошнія некалькі гадоў удалося істотна палепшыць сітуацыю. У прыватнасці, скарацілася колькасць дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Дзяржава прымусіла нядбайных бацькоў працаваць і плаціць за ўтрыманне сваіх дзяцей. І многія з іх пачынаюць нармальнае жыццё, дзеці вяртаюцца ў свае сем'і.

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў бліжэйшы час будзе праведзена комплексная праверка стану спраў у гэтай сферы.

Беларускі лідар лічыць, што да бацькоў, якія кінулі сваіх дзяцей, павінны прымяняцца самыя строгія меры. Прафсаюзы павінны таксама ўнесці свой уклад у вырашэнне праблемы сацыяльнага сіроцтва, хаця б у плане кантролю за нядобранадзейнымі сем'ямі.

Кіраўнік дзяржавы таксама сказаў аб тым, што важнай задачай з'яўляецца перасяленне дзяцей з дамоў-інтэрнатаў у дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. У будучай пяцігодцы гэта трэба завяршыць, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама адзначыў, што дзяржава будзе ўсяляк падтрымліваць такія дзіцячыя дамы.

### Скарэктаваць жыллёвую праграму з улікам таго, што ў краіне трэба вырашаць дэмаграфічную праблему

«Калі і ў далейшым мы не будзем забяспечваць дадатнага прыросту насельніцтва, мы як дзяржава не адбудземся, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Нам трэба хоць бы 30 млн чалавек, а мы да 30 млн не дацягваем. Што такое 10 млн на такую тэрыторыю?»

Менавіта таму, як лічыць беларускі лідар, нават жыллёвую праграму трэба карэктаваць пад вырашэнне гэтай праблемы. Штосьці ў гэтым напрамку ўжо зроблена, але гэтага недастаткова.

«Трэба больш прынцыпова падысці да вырашэння гэтага пытання. З'яўляецца ў сям'і трэцяе дзіця — гарантавана кватэра. І, можа быць, за 25 працэнтаў яе кошту, а можа быць, і бясплатна», — сказаў Прэзідэнт. Толькі ў выпадку належнага матэрыяльнага стымулявання магчыма вырашыць гэту праблему, перакананы кіраўнік дзяржавы. Цяпер для большасці беларускіх сем'яў мецьдваіх дзяцей — норма, а вось адважыцца на нараджэнне трэцяга дзіцяці ўжо цяжкавата. «Дзяржава павінна дапамагчы сем'ям для таго, каб яны мелі траіх дзяцей. Трое дзяцей у сям'і — гэта ўжо істотны прырост насельніцтва. А калі мы сканцэнтруем рэсурсы на аказанні дапамогі сям'і пры нараджэнні чацвёртага і пятага дзіцяці, то гэта дапаможа вырашэнню дэмаграфічнай праблемы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

# У Бабруйску адновяць сабор Аляксандра Неўскага

## Чын закладкі краевугольнага каменя ў падмурак сабора ўзначаліў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт

**Сабор Аляксандра Неўскага адновяць у Бабруйскай крэпасці. Яго пабудавалі напрыканцы XIX стагоддзя пад кіраўніцтвам вядомага архітэктара Аляксандра Штаўберта. Гэта быў ваенны сабор, прызначаны ў асноўным для афіцэраў і салдат, якія неслі службу ў крэпасці.**

У 1934 годзе сабор Аляксандра Неўскага падарвалі, прычым ад моцнага выбуху пацярпелі будынкі навокал, былі і чалавечыя ахвяры. Два гады таму пры будаўнічых працах на тэрыторыі Бабруйскай крэпасці знайшлі падмурак сабора. Духавенства і вернікі вырашылі аднавіць яго на старым месцы.



— Гэта сапраўды вельмі значная падзея, таму што з сабора пачнецца адраджэнне ўсёй Бабруйскай крэпасці, гістарычнага ядра горада і ўнікальнага помніка ваеннай гісторыі нашага народа, — сказаў епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім.

16 верасня ў Бабруйскай крэпасці сабралася шмат гасцей. Мітрапаліта Філарэта сустракалі святары і вернікі, хор спяваў «Верую!», дзеці дарылі кветкі.

— Дай сілы і разуменне аднавіць нашы святыні на зямлі Магілёўскай, і дзякуй за першыя ўпэўненыя крокі на гэтым шляху, — сказаў Мітрапаліт Філарэт.

У чыне закладкі сабору прынялі ўдзел прадстаўнікі вышэйшага праваслаўнага духавенства, кіраўніцтва Магілёўскай вобласці і горада Бабруйска, прадстаўнікі ваеннага ведамства, а таксама прыбыў ганаровы госць — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Аляксандр СУРЫКАЎ.

— Гэта значная падзея для Расіі і Беларусі — аднаўленне воінскага храма Аляксандра Неўскага, рускага князя, вядомага сваімі перамогамі, — пракаментаваў Аляксандр Сурыкаў. — Гэта помнік воінскай славы расіян і беларусаў.



У падмурак сабора ўрачыста заклалі капсулу: у ёй грамата аб закладцы з подпісамі ўдзельнікаў цырымоніі. Праўда, у Бабруйску спадзяюцца, што нашчадкі гэтую капсулу ніколі не ўбачаць, а новы храм будзе доўга стаяць і служыць людзям.

Захаваліся чарцяжы і фотаздымкі сабора Аляксандра Неўскага, які быў узведзены ў стылі ампір. Новы сабор будзе вельмі падобны на той велічны будынак, які разбурылі пры савецкай уладзе.

Сталыя жанчыны плакалі ад радасці, што храм адновяць, а людзі вяртаюцца да старой веры. Больш маладзейшыя казалі, што гэты храм — гонар для ўсяго Бабруйска. Мужчыны запэўнівалі, што абавязкова будуць браць удзел у будаўнічых працах. Людзі не сумняваюцца, што сабор адновяць хутка.

— Мяркуем, што праз год, максімум — праз два, сабор будзе, — сказаў епіскап Серафім. — Гэта будзе не толькі храм, але і сімвал воінскай славы. Ён мае вялікае значэнне для ўсіх нас.

На цырымоніі падкрэслівалася, што Бабруйская крэпасць і сабор Аляксандра Неўскага — гэта частка агульнай гісторыі беларускага і расійскага народаў. Таму Аляксандр Сурыкаў абяцаў дапамогу ў справе аднаўлення сабора. Пасол таксама адказаў на пытанне журналістаў пра расійска-беларускія дачыненні:

— Здараецца, што ў інфармацыйнай прасторы з'яўляюцца незразумелыя рэчы, але я думаю, што перамелецца — мука будзе. Нашы эканамічныя сувязі толькі мацнеюць, культурныя — таксама, духоўнасць набывае новыя патэнцыялы. Тое, што з'яўляецца ў інфармацыйнай прасторы, — гэта часовыя справы. Усё стане на свае месцы. А аднаўленню сабора Аляксандра Неўскага мы паспрыяем фінансамі.

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**

## ПА АРЭХІ НА ДРЭВА

палез 85-гадовы жыхар вёскі Лучажэвічы Мазырскага раёна. Як паведамілі ў дзяжурнай часці Мазырскага РАУС, сталы мужчына, як заўсёды, паставіў лесвіцу, але ж не ўтрымаўся і сарваўся ўніз, на асфальт. Дзядуля знаходзіцца ў бальніцы, але ж атрыманая траўма не вельмі складаная. Можа, ён не раз яшчэ будзе абіраць арэхі з дрэў?

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


**ПРОДАЖА НА ТОРГАХ ЗДАНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ**

**КУПП «Виттекс»**

**(36 кв. м; 40,8 кв. м; 793,9 кв. м; 1042,7 кв. м; 1207,8 кв. м; 1189,9 кв. м; 2939,2 кв. м)**

**в г. Витебске по ул. Володарского, 100.**

**ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ.**

Информация на сайте: www.vitinvest.biz.

Тел.: 431498, +375336480387; +375292962323 МТС.

УНП 300149663


# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗАХОДНЯЯ ПРЭСА СКЛАЛА СПІС «ЗОРАК», ЯКІМ ПАРА НА СПАЧЫНАК: У СПІС ПАТРАПІЎ І УЛАДЗІМІР ПУЦІН

**Падставай да складання такога спісу надакучыўшых знакамітасцяў сталі не піяр-акцыі палітыкаў, а з'яўленне 64-гадовай спявачкі Шэр у неверагодна адкрытым уборы на ўручэнні ўзнагарод MTV.**

Расійскі прэм'ер-міністр Уладзімір Пуцін таксама патрапіў у спіс публічных асобаў, якім, на думку The Washington Post, ужо пара адысці ад успышак фотакамер на спачынак у глухую вёску. «Экс-прэзідэнт, а цяпер прэм'ер-міністр Расіі, любіць з'яўляцца на публіцы. Ён паказаў нам свае мускулы. Мы бачылі, як ён займаецца дзюдо, палюе на кітоў і ездзіць на Harley. Магчыма, былому супрацоўніку КДБ, які калісьці заявіў, што сталінскія рэпрэсіі бляднеюць у параўнанні з атамнымі бамбардзіроўкамі Хірасімы і Нагасакі, пара адысці на спачынак на яго дачу», — цытуе аўтараў артыкула InoPressa. Паўночнакарэйскаму лідару Кім Чэн Іру, на думку выдання, і зусім даўным-даўно пара на пенсію — у дом для састарэлых у Пхеньяне. Яго ўжо гатовае змяніць маладое пакаленне. У лік патэнцыйных пенсіянераў патрапілі таксама Дональд Трамп і Мік Джагер. Ад іх эпатажных выхадак і голых торсаў прэса ўжо стамілася, упэўненыя амерыканскія журналісты.

### ПРЭЗІДЭНТ НАЗАРБАЕЎ ПААБЯЦАЎ КІРАВАЦЬ КАЗАХСТАНАМ МІНІМУМ ДА 2020 ГОДА

**Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў збіраецца не проста балатавацца ў прэзідэнты ў 2012 годзе, але і застацца ва ўладзе як мінімум да 2020 года, гэта значыць яшчэ на працягу дзесяці гадоў. Пра гэта паведаміў агенцтву Reuters саветнік кіраўніка дзяржавы па палітычных пытаннях Ермухамет Ертысбаеў. У 2012 годзе Назарбаеў мае намер выступіць у якасці кандыдата ў прэзідэнты ў чацвёрты раз за сваю палітычную кар'еру. Паводле слоў Ертысбаева, цяперашні лідар краіны не бачыць сур'ёзных супернікаў, якія маглі б перашкодзіць яму зноў застацца кіраўніком дзяржавы, а таксама не бачыць унутраных пагроз сістэме, створанай ім. Саветнік нагадаў, што Назарбаеў, згодна з папраўкамі, унесенымі ў 2007 годзе ў Канстытуцыю, мае права неабмежаваную колькасць разоў вылучаць сваю кандыдатуру на выбарах.**

### ЦАНА КАХАННЯ — ДВОЕ БЛІЗКІХ СЯБРОЎ

**Набываючы каханне, чалавек страчвае ў сярэднім да двух сяброў, паказалі даследаванні. Такія высновы (пра іх піша ў чацвер BBC) зрабілі навукоўцы з Оксфардскага ўніверсітэта, якія папрасілі 540 чалавек ва ўзросце пасля 18 гадоў ацаніць, як змянілася колькасць іх сяброў падчас пачатку чарговага рамана.**

Высветлілася, што людзі маюць у сярэднім да пяці блізкіх сяброў, а ў выпадку з'яўлення палюбоўніка гэта колькасць змяншалася на два.

«Закаханыя замест пяці сяброў у сярэднім называлі толькі чатырох. Улічваючы, што адзін з іх — навічок, які ўвайшоў у ваша жыццё, гэта значыць, што вам прыйшлося адмовіцца ад двух іншых», — тлумачыць прафесар эвалюцыйнай антрапалогіі Робін Данбар.

### RUE МОЖА САРВАЦЬ АЦЯПЛЯЛЬНЫ СЕЗОН ВА УКРАІНЕ: ГАЗ ПРАДАДУЦЬ ЗА МЯЖУ

**Уладальнік RosUkrEnergo Дзмітрый Фірташ можа сарваць ацяпляльны сезон ва Украіне. Кампанія прадпрымальніка Emfesz будзе будаваць у Венгрыі электрастанцыю, а газ будзе браць з украінскага сховішча, паведамляе партал NEWSru.ua. На гэтым прадпрымальнік зможа зарабіць на 3 млрд долараў больш, чым ад продажу газу ва Украіне. У «Нафтагаза» ў гэтым выпадку ўзнікнуць праблемы з праходжаннем ацяпляльнага сезона, упэўненыя эксперты. Недастатковыя аб'ёмы давядзецца дакупляць у «Газпрама», каб паставіць іх на ўнутраны рынак. Гэта нявыгадна «Нафтагазу», асабліва з улікам таго, што ў наступным годзе цэны на газ павінны вырасці.**

### СКАНДАЛ З ЛУЖКОВЫМ МОЖА ПРЫВЕСЦІ ДА КРАХУ ПАЛІТЫЧНАЙ КАР'ЕРЫ МЯДЗВЕДЗЕВА



**Газета Die Zeit упэўненая, што нападкі на Лужкова СМІ робяць па заказе прэзідэнта Мядзведзева ў рамках яго барацьбы за ўладу з прэм'ерам Пуціным. Як лічыць выданне, сітуацыя з Лужковым можа выліцца ў адкрытую барацьбу паміж Пуціным і Мядзведзевым, прыкметы якой эксперты адзначалі і да скандалу з мэрам.**

Ад зыходу скандалу вакол мэра Масквы Юрыя Лужкова залежыць палітычная будучыня прэзідэнта РФ Дзмітрыя Мядзведзева, таксама лічаць заходнія СМІ. На думку аналітыкаў, калі Лужкоў застанецца ў крэсле сталічнага граданачальніка, стане відавочнай непераканаўчасць Мядзведзева, і ён пазбавіцца шанцаў на перавыбранне ў 2012 годзе.

## Бешанковіцкія цяльняшкі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Будаўнікі-каменшчыкі Пятро ЛЕЙЧАНКА і Алег ШОРАХАЎ з Бешанковічаў узводзяць два новыя дамы ў вёсцы Верхняе Крывіна.


**АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ**

**WWW.RLT.BY**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ЧУП «Минская межрайбаза ОПС» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже магазинов, в составе:**

**Лот № 1:** здание магазина (инв. № 600/С-125942), об. пл. 94,9 кв.м, **Минский р-н, Роговский с/с, п. Довборово.**

**Начальная цена с НДС – 21 600 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,1093 га.**

**Лот № 2:** здание магазина (инв. № 600/С-125584), об. пл. 56,7 кв.м, **Минский р-н, Роговский с/с, д. Кукелевщина.**

**Начальная цена с НДС – 6 000 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,0446 га.**

**Лот № 3:** здание магазина (инв. № 600/С-125583), об. пл. 32,8 кв.м, **Минский р-н, Роговский с/с, д. Ашнарово.**

**Начальная цена с НДС – 5 000 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,0176 га.**

**Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, **если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **19.10.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 18.10.2010 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**


ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.09.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 030,00 | 1 чэшская крона | 160,28 |
| ▲ 1 еўра | 3 946,58 | 1 польскі злоты | 1002,15 |
| 1 латвійскі лат | 5 565,25 | ▼ 1 расійскі рубель | 97,67 |
| 1 літоўскі літ | 1 142,15 | 1 украінская грыўня | 382,70 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 31,0223 |
| 10 UAH | 39,1819 |
| 1000 BYR | 10,2519 |
| EUR | 40,3166 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

### У ВАГОНЕ ПАД БЯРВЁНАМІ...

На прапускным пункце «Буг» памежнікі вырашылі праверыць паўвагон з лесам, які накіроўваўся ў Польшчу. Пад бярвёнамі на глыбіні метра былі схаваныя 3 тысячы пачак цыгарэт, якія мытнікі канфіскавалі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# ПЯТНІЦА, 24 ВЕРАСНЯ

## ПЕРШЫ

**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**6.05, 1.15** Дзень спорту.
**6.10, 7.10, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**7.05, 8.10** Зона Х.
**7.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.35** Сфера інтарэсаў.
**9.05, 19.55 Серыял «Ганначка».**
**10.00 Серыял «Спальны раён».**
**11.00, 17.55 Дэтэктыў «Апошні кардон».**
**12.10 Меладрама «Інфант».**
**14.10** «Невядомая версія. «Іван Васільевіч мяняе прафесію».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Дак. фільм «Завядзёнка».
**16.00 Серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу».**
**16.50** «Жыццё як жыццё».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**21.00** Панарама.
**21.55** «Мая праўда». «Група «Міраж».
**23.05** «Грунвальд». «Перамога».
**23.30 Баявік «Экстрэмальнае спатканне».**

## АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 1.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.15 Серыял «Мая жонка мяне прываражыла».**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 1.45** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Шалёны анёл».**
**12.15** «Чакай мяне». Беларусь.
**13.10** «Кантрольная закупка».
**13.45** «Модны прыгавор».
**14.50** «Зразумець. Даравацъ».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**17.05 Серыял «Слова жанчыне».**
**18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».**
19.00 «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Вялікая розніца» ў Адэсе. Фестываль пародый.
**22.55** «Наша Белараша».
**23.30 Маст. фільм «Абрабаванне на Бэйкер-Стрыт».**

## ЛАД

**6.35** Жаночая ліга.
**7.00** ЛАДная раніца.
**8.00, 20.15** Тэлебарометр.
**8.05 Серыял «Інтэрны».**
**8.35, 14.35 Серыял «Людзі Шпака».**
**9.35, 18.00 Серыял «Каханне як каханне».**
**10.45** Час футбола.
**11.15** Дак. фільм «Лепшыя кампазітары сусветнага кінематографа. Морыс Жар».
**12.10 Серыял «Пакахай мяне зноў».**
**13.15** М/с «Дракончык і яго сябры»
**13.30** Пазакласная гадзіна.
**13.45, 23.40 Серыял «Налётчыкі».**
**15.40** Усё пра бяспеку.
**16.10** Баскетбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Аўстралія—Беларусь.
**19.05** «Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**20.00** Калыханка.
**20.20** «Бітва экстрасэнсаў».
**21.25 Камедыя «Мянялы».**
**23.10** «Пра мастацтва».

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10** «СТБ-спорт».
**8.30, 20.25 Серыял «Жорсткі бізнэс».**
**9.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40 Серыял «Багатая і каханая».**
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35 Серыял «Мачаха».**
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40 Серыял «Студэнты 2».**
**15.35** «Брэйн-рынг».
**16.50** «З чаго пачынаецца Радзіма».
**18.30** «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Камедыя «Красуні».**
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьма-нявідзьма».
**0.05 Маст. фільм «Заражаны».**
**1.50 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».**

## МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 21.00, 23.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці.
**5.05** «Прагрэс».
**6.05** «Цік-так».
**6.20** М/с «Казкі лясных чалавечкаў».
**6.30 Серыял «Біндзі: дзяўчынка з джунгляў».**
**7.05** «Адкрытая гутарка».
**7.35 Серыял «Дзядуля маёй мары».**
**8.05 Серыял «Нашы суседзі».**
**9.05** «Смачны свет. Ненецкая кухня».
**9.40, 20.40, 2.50** «Рэспубліка сёння».
**10.05 Серыял «Ваўчыха».**
**11.05, 3.10 Маст. фільм «Брыльянты для дыктатуры пралетарыяту».**
**13.05** М/с «Прыгоды ў краіне эльфаў».
**13.30 Серыял «Старшакласнікі 2».**
**14.05** «Хіт-экспрэс».
**15.20** «Даведнік».
**16.05, 0.05 Серыял «Вядзьмарскае каханне».**
**17.05** «Прагрэс».
**18.20** «Акцэнты».
**18.30** «Дыяспары».
**19.00, 1.05 Маст. фільм «Патруль».**
**21.20** «Зорнае жыццё».
**22.10 Маст. фільм «Дарога на Велвіл».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 10.55, 12.55, 16.25, 19.40, 21.10, 23.40** «Надвор'е».
**7.05 Серыял «Сям'я Кардзье». 1-я серыя.**
**9.00** «Мой любімы гадаванец».
**9.30, 16.00** Мультпарад.
**10.00 Серыял «Горац».**
**11.00 Трылер «Шэпт».**
**13.00 Дэтэктыў «Пальчаткі забойцы».**
**14.40, 19.20, 23.20** «Кінаблакнот».
**15.00 Серыял «Альф».**
**16.30 Серыял «Гром у раі».**
**17.30** «Адшукваецца адпачынак».
**18.00 Серыял «Абаронца».**
**19.00** «Бульбокс».
**19.45 Серыял «Яе звалі Нікіта».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «К-відэа для ўсёй сям'і».
**21.15 Трылер «Тэкілавае світанне».**

## ВТБ

**6.00, 23.30** «PLAY».
**8.00, 18.00, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 14.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00, 15.00, 19.00 Серыял «Ранеткі».**
**11.00** «Forward».
**16.00 Камедыя «Лапачка».**
**21.00 Камедыя «Два светы».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.20, 19.25 Серыял «Ефрасіння».**
**10.10** «Мой сярэбраны шар. Грэта Гарбо».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25, 17.15 «Кулагін і партнёры».**
**11.55 , 20.25** «Земскі доктар».
**13.50, 16.50, 18.50, 22.20** Навіны — Беларусь.
**14.25** «Пра самае галоўнае».
**15.20** «Сапраўднае жыццё».
**16.05** «Формула кахання».
**17.50 Серыял «Чорная багіня».**
**22.30** «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгена Петрасяна».
**0.40 Маст. фільм «Ненаглядны мой».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «НТБ раніцай».
**8.25** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**8.45** «Рускія сенсацыі».
**9.35, 18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «І зноў прывітанне!».
**11.10** «Лепшы горад Зямлі».
**12.00 Серыял «Угро».**
**13.30 Серыял «Закон і парадак».**
**16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**19.35** «Брэст. Крапасныя героі».
**21.00** «НТБшнікі». Пара валіць з Рашкі?».
**22.10 Маст. фільм «Пытанне гонару».**
**23.55 Дэтэктыў «Шызафрэнія».**

## ТНТ

**5.00** «Забойнай ночы».
**6.00** Таксі.
**6.35, 10.30** «Нікеладэон на ТНТ».
**7.30, 14.05 Серыял «Лузеры».**
**8.30, 17.30 «Універ». Сітком.**
**9.30, 18.00 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**13.00 Серыял «Саша + Маша».**
**13.30** «Жаночая ліга».
**15.00 Меладрама «Круты Джо».**
**17.00 «Інтэрны». Сітком.**
**19.00** «Бітва экстрасэнсаў».
**20.00, 0.00** «Камедзі Клаб».
**21.00** «Comedy Woman».
**22.00, 1.50** «Дом-2».
**23.30** «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
**1.00 Серыял «Кайл XY».**
**2.45 Камедыя «Рызыкоўны бізнэс».**
**4.45** «Камедыянты».

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.30, 18.30, 22.30** Навіны культуры.
**9.20** Галоўная роля.
**9.45, 22.50 Маст. фільм «Вайна і мір».**
**11.20** «Вясёлка з нябёсаў».
**12.00** Дак. фільм «Гладыятары».
**12.55** «Падарожжы музыканта».
**13.25 Серыял «Дзень за днём», заключная серыя.**
**14.40** «У музей — без павадка».
**15.00** «За сямю пячаткамі».
**15.30** Дак. серыял «Дзённік вялікай коткі».
**16.05** Дак. фільм «І вечнасцю напоўнена імгненне».
**16.30** «Сусветныя скарбы культуры».
**16.45** Білет у Вялікі.
**17.25, 0.55** Дак. фільм «Адчайныя дэгустатары адпраўляюцца... у 70-я».
**18.45** Смеханастальгія.
**19.15** «Сферы» .
**19.55 Маст. фільм «Му-Му».**
**21.30** «Лінія жыцця».
**0.25** «Хто там...».
**0.50** Праграма перадач.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Усё пачынаецца з дзяцінства. В. Спасіўцаў». Дак. фільм.
**5.50** «Музыка ў тэатры, у кіно, на ТБ». 1984 год.
**6.25, 12.30** М/с «Чараўнік Ізумруднага горада».
**6.50, 12.50 «Шафёр на адзін рэйс». Маст. фільм.**
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00** «Такія розныя характары». Дак. фільм.
**11.00** «Музычны кіёск». 1988 год.
**11.30** «Клуб падарожнікаў» . 1980 год.
**16.00** «Тэма». 1993 год.
**17.00** «Сяргей Бандарчук». Дак. фільм.
**18.00** «Дзякуй за нялётнае надвор'е». Фільм-канцэрт. 1981 год.
**18.55** «Паехаць... Застацца...». Дак. фільм.
**22.00** «Кінапанарама» 1982 год.
**23.00** «Бітламанія».
**23.40** «Прыступкі». 1989 год.
**0.30** «Уся ўлада ЛЮБЭ!». Фільм-канцэрт. 1991 год.
**1.30** «Асоба». Дак. фільм пра Э. Радзінскага.
**4.00** «Вось песня праляцела і..ага!». Фільм-канцэрт. 1987 год.

## НАША КІНО

**6.30, 12.30** Драма «Грыбны дождж».
**7.45, 13.45** Камедыя «Мядзведзь».
**8.30, 14.30** Кінаэпапея «Блакада. «Аперацыя «Іскра».
**9.40, 15.40** Маст. фільм «Начальнік».
**10.30, 16.30** Маст. фільм «Апошняе паляванне».
**18.30, 0.30** Меладрама «Простая гісторыя».
**20.00** Плюс кіно.
**20.30, 2.30** Драма «Кантракт стагоддзя».
**22.40, 4.40** Маст. фільм «Гоншчыкі».

## ДОМ КІНО

**3.00, 11.00, 19.00** Серыял «Лясун. Працяг гісторыі».
**3.55** Маст. фільм «Шэпт аранжавых аблокаў».
**5.35** Маст. фільм «Служылі два таварышы».
**7.10** Меладрама «Позняе каханне».
**9.40** Камедыя «Непапраўны ілгун».
**11.50** Меладрама «Старамодная камедыя».
**13.25** Маст. фільм «Лёс чалавека».
**15.05** Меладрама «Безыменная зорка».
**17.15** Камедыя «Чатыры таксісты і сабака».
**19.55** Маст. фільм «Геній пустога месца».
**21.30** Маст. фільм «Інтэрдзяўчынка».
**23.55** Маст. фільм «Казка падарожжаў».
**1.40** Меладрама «Толькі ўдваіх».

## ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Трылер «Чорная скрыня».
**10.30, 18.30, 2.30** Драма «Выдуманыя героі».
**12.25, 20.25, 4.25** Меладрама «Цёмны бок сонца».
**14.10, 22.10, 6.10** Драма «Спецыяльнае падраздзяленне».
**15.05, 23.05, 7.05** Драма «Шаша нумар 9».

## ТБ1000

**3.00** Трагікамедыя «Траса 60».
**5.00** Камедыя «Лёгкія паводзіны».
**7.00** Трагікамедыя «Дымавыя сігналы».
**8.35** Драма «Высокая мода».
**11.00** Камедыя «Хлопцы з жаночага інтэрната».
**12.40** Драма «Дзеля любові да гульні».
**15.00** Драма «Пудра».
**17.00** Камедыя «Прывітанне, Біл!».
**19.00** Драма «Зламаныя кветкі».
**21.00** Драма «Матч Поінт».
**23.05** Трылер «Страх».
**1.00** Драма «Вяртанне ў рай».

## ТБ3

**5.00** М/ф «Гадзіла».
**5.30** М/ф «Паляўнічыя на прывідаў».
**6.00** Дак. фільм «Паддоследны трус».
**6.30, 15.00** «Як гэта зроблена».
**7.00** Дак. фільм «Сучасныя цуды».
**8.00, 13.00** «Хатні рэстаран».
**9.00, 17.00** «Лялечны дом». Серыял.
**10.00** «Касл». Серыял.
**11.00** «Казакі-разбойнікі». Серыял.
**12.00** Дак. фільм «Фактар рызыкі».
**14.00** Дак. фільм «Паляўнічыя на монстраў».
**15.30** Дак. фільм «Свет у разрэзе».
**16.00** «Уцякач». Серыял.
**18.00** Маст. фільм «Прывід».
**21.45** «Сховішча». Серыял.
**22.45** «Псі-фактар». Серыял.
**23.45** Еўрапейскі покерны тур.
**0.45** Маст. фільм «Баншы!».
**2.45** «Анёл». Серыял.
**3.45** «Зена — каралева воінаў». Серыял.
**4.45** Пакой страху.

## РАМАНТЫКА

**7.00, 18.40, 2.40, 5.20** «Дзеля кахання Глорыі».
**7.55, 10.40, 20.30** «Без вестак зніклая».
**8.50, 14.10, 0.55** «Паляванне на мільянера».
**9.45, 15.05, 3.35** «Доля-ліхадзейка».
**11.30, 16.55, 17.45, 21.20** «Паслухай, красуня».
**12.25, 1.50, 6.10** «Жанчыны на сцежцы вайны».
**13.20, 23.05, 4.30** «Мая Папялушка».
**16.00, 19.35, 22.10** «Дасканалая прыгажосць».
**0.00** «Парадоксы кахання».

## DIVA UNIVERSAL

**1.00** «Дэтэктывы пад сукном-IV». Дэтэктыў.
**1.50** «Дарога ў Хоп Роўз». Маст. фільм.
**3.30, 7.30** «Таямнічая жанчына: Бачанне забойства». Маст. фільм.
**5.00** «Дочкі Маклеода-VII». Серыял.
**5.50, 10.50** «Джордан расследуе». Серыял.
**6.40, 12.30, 18.20** «Дамы сям'і Гілмор». Серыял.
**9.10** «Спадарожнікі і метэарыты». Маст. фільм.
**11.40, 19.10** «Сапраўдныя хатнія гаспадыні акругі Орындж». Серыял.
**13.25** «Кватэра нумар 12». Маст. фільм.
**15.05** «Рэстаранны раман». Маст. фільм.
**16.40** «Рэаліі кахання». Маст. фільм.
**20.00** «Добрая жонка». Серыял.
**20.50** «Копы-навабранцы». Серыял.
**22.30** «Прага поспеху» . Драма.

## SyFy

**7.30, 13.20** Зачараваныя.
**9.10, 15.00, 18.20, 0.05** Па слядах прывідаў.
**10.00, 15.50, 0.55** Прытворшчык.
**11.40** Легенда пра Шукальніка.
**17.30, 19.10, 23.15** Пункт прызначэння — праўда.
**20.00** «Стыгматы». Драма.
**21.40** «Горш не бывае». Драма.
**1.45** Кароткаметражныя фільмы.

## ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00** Фільм-казка «Пасля дажджычку, у чацвер...».
**6.15, 10.15, 14.15** М/с «Маўглі». «Выкраданне»; зборнік м/ф: «Як качаня-музыкант стала футбалістам», «Чуня».
**7.00, 11.00** Казкі рускіх пісьменнікаў. «Тайна запечнага цвыркуна»; зборнік м/ф: «Церам-церамок», «Змей на гарышчы», «Жывая цацка», «Вясёлая карусель» № 6.
**8.00, 12.00** Казкі народаў свету. «Місіс Уксус і містэр Уксус»; зборнік м/ф: «Снежныя дарожкі», «Каралева Зубная шчотка», «Парася ў калючым кажушку», «Дождж».
**15.00** Маст. фільм «Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна». 1-я серыя.
**16.15** М/с «Маўглі». «Апошняе паляванне Акелы»; м/ф «Зноў двойка» (Прыгоды Мурзілкі).
**17.00** Казкі рускіх пісьменнікаў. «Коткін дом»; зборнік м/ф: «Залаты хлопчык», «Вясёлая карусель» № 4.
**18.00** Казкі народаў свету. «Выхвальнае мышаня»; зборнік м/ф: «Чые ў лесе шышкі?», «Дзіцячы альбом», «З каго браць прыклад?».

## ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Як не страціць здароўе.
**5.30, 20.30** Пазнай сябе.
**6.00, 21.00** Правілы здароўя.
**6.25, 21.30** Я расту.
**6.55, 09.45, 14.30, 22.00, 0.55, 4.55** Азбука здароўя.
**7.00, 11.00, 22.05, 2.00** Як пражыць даўжэй.
**7.50, 15.20, 23.00** Набалелае пытанне.
**8.30, 23.40** Выдаткі вытворчасці.
**9.00, 15.05, 0.10** Энцыклапедыя памылак.
**9.15, 0.25** Цела чалавека.
**9.50, 1.00** Кабінет прыгажосці.
**10.20, 1.30** Школа розуму.
**11.50, 2.50** Смак да жыцця.
**12.30, 3.30** Будзем здаровыя.
**13.00, 4.05** Уся праўда пра ежу.
**14.00** Курс лячэння.
**14.35** Панацэя.
**16.00** Не выходзячы з дому.
**16.30** Ты тое, што ты ясі.
**17.00** Нетрадыцыйная медыцына.
**17.30** Практыка здароўя.
**18.00** Гісторыя хваробаў.
**18.30** Хто старэе хутчэй?
**19.00** Пра дыеты і не толькі.
**19.30** Найноўшыя дасягненні.

## ТДК

**6.00, 10.50, 11.50, 13.00, 14.00, 14.50, 17.50, 18.50, 22.00** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 14.55** Усё лепшае, для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 22.10, 5.00** Ваш доктар.
**7.50** Сакрэты здароўя.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00, 1.00** Красуня.
**11.00, 14.00, 2.00** Нашы дзеці.
**13.25, 4.00** Твой дом.
**15.55, 20.00** Ваш асабісты псіхолаг.
**16.50** Дыягназ—здаровы.
**19.00, 22.30** Люстэрка жыцця.
**21.00, 23.30** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Гісторыя поспеху.

## DISCOVERY

**7.00, 14.45** «Пятая перадача».
**7.25, 15.15** «Брудная работка».
**8.20** Выжыць любой цаной.
**9.15, 18.00, 22.00, 3.50** Разбуральнікі легендаў.
**10.10, 2.55, 6.05** Новы свет.
**11.05** «Як гэта працуе».
**11.30, 19.30, 5.40** Як гэта ўстроена?
**12.00** Я не павінен быў выжыць!
**12.55, 20.00, 0.30** «Top Gear».
**13.50** Круты цюнінг.
**16.10** Спецназ «Смерць шкоднікам».
**17.05** Крутыя выбухі.
**19.00, 5.10** Патрабуецца зборка.
**21.00, 1.30** Рыба-меч.
**23.00** Нацыя, якая адпачывае.
**0.00, 4.45** «Маланкавыя катастрофы».
**2.25** Скрыўленне часу.

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Небяспечныя сустрэчы.
**6.00** Дагістарычныя драпежнікі.
**7.00, 12.00** Анаконда.
**8.00, 13.00** У аб'ектыве.
**9.00** Тайны гарылаў.
**10.00** Экстрэмальнае выратаванне.
**11.00** Мегаполісы.
**11.30, 19.30, 1.30** Даведнік па свеце для гурманаў.
**14.00** Жыццё да нараджэння.
**15.00** Поле бою драпежнікаў.
**16.00, 4.00** Рэальнасць або фантастыка?
**17.00** Вырашальны ўдар.
**18.00** Навука рукапашнага бою.
**19.00, 1.00** Што будзе, калі...?
**20.00, 23.00, 2.00** З пункту гледжання навукі.
**21.00, 0.00, 3.00 2012**: апошняе прадказанне.
**22.00** Забароны.

## TRAVEL

**5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 23.00, 2.00** Сусветны падарожнік.
**6.00, 15.00** Падарожжы па краіне Оз.
**6.30** Сафары для бабуль.
**7.00, 13.00** Лепшыя падарожжы.
**7.30, 13.30** Раскошныя месцы адпачынку.
**8.00, 16.00, 4.30** Падарожжы па месцах вінаробства.
**8.30, 16.30** Хутка адкрыццё.
**9.00** Прыгоды на колах.
**9.30** Пра галоўнае.
**11.00, 15.30, 4.00** Сафі Грыгсан едзе на Усход.
**11.30, 19.30, 0.30** Прагны вандроўнік.
**12.00** Энтрада.
**12.30** Далёкія берагі.
**19.00, 0.00** Беражыце дрэвы.
**20.00, 1.00** Даведнік для шукальнікаў прыгод.
**20.30, 1.30** ФотаДаследчыкі.
**22.00, 3.00** Бясстрашныя падарожнікі.

## ANIMAL PLANET

**7.00** «Разбуральнікі стэрэатыпаў».
**7.25** Маёнтак сурыкатаў.
**7.50** «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
**8.40** Усё пра сабак.
**9.35, 6.25** Планета дзікіх.
**10.00, 16.25** На волю з пітбулем.
**10.55** «Малпіна жыццё».
**11.20** Пад покрывам ночы.
**11.50** Тэрыторыя жывёл.
**12.45** Ветэрынары-стажоры.
**13.10** «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
**13.40, 22.55, 3.30** Паліцыя Маямі — аддзел па абароне жывёл.
**14.35** «SOS дзікай прыроды».
**15.00, 6.10** Шатландскае таварыства абароны жывёл.
**15.30, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**17.20** Справа майстра баіцца.
**18.15** Дзіўныя прыгоды ў акіяне.
**19.10, 23.50, 4.25** Медуза-забойца.
**21.05, 1.40** Кітовыя войны.
**22.00, 2.35** Жыццё з чалавекам-ваўком.
**0.45, 5.20** Дзікія і небяспечныя.

## EUROSPORT

**9.30** Дзюдо. Чэмпіянат свету.
**10.00, 14.30, 22.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету.
**11.00, 19.00, 20.10, 1.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**20.00** Футбол. Еўрагалы.
**0.00** Ралі. серыя IRC.
**0.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.

## MTV

**5.00** Russian music.
**6.00** «Стэрэа_раніца».
**8.40** «Губка Боб квадратныя штаны».
**9.05** Вобыск і спатканне.
**9.30** Тайныя спакусы курортнага гатэля.
**9.55** Кахаць або забіць?
**10.25, 23.05** Трэндзі.
**10.55** Зоркі на далоні.
**11.25** Руская дзясятка.
**12.20, 22.55** News блок.
**12.30** Ікона відэагульняў.
**13.00** Тачку на пракачку.
**13.25** Наступны.
**13.50** Спатканне на выжыванне.
**14.15** Ужо можна.
**14.40, 18.25** Чыкі & Фрыкі.
**15.35, 19.10** «Подыум».
**16.25** Мадэльная школа ведзьмы Джэніс.
**16.50, 20.35** Дрэнныя дзяўчынкі.
**17.15, 21.30** «Каханне на шасцярых». Серыял.
**17.50, 21.00** «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.
**20.00** Папялушка 2:0.
**22.05** «Клініка». Серыял.
**22.30** «Пяцёра пад сонцам». Серыял.
**23.35** “World Stage”: Beyonce.
**0.35** Music.

## ІНТЭР+

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**7.10, 7.40, 8.10, 8.40** Раніца з Інтэрам.
**9.10** Бацькі, якія кормяць.
**9.20, 17.25, 0.50** Серыял «Простыя ісціны».
**10.15, 18.20, 1.45** Серыял «Свая каманда».
**10.45, 18.45, 3.30** Серыял «Суседзі».
**11.10, 20.30** Серыял «Заручальны пярсцёнак».
**12.15** Я ўсё пра Вас ведаю.
**13.00** Ключавы момант.
**13.50** Знак якасці.
**14.20, 6.00** Дак. фільм «Маладыя горы».
**15.10** Маст. фільм «Ніягара».
**16.40, 4.00** Судовыя справы.
**19.15, 2.15** Серыял «Танга ўтраіх».
**20.00, 3.00** «Падрабязнасці».
**22.00** Вялікая палітыка.
**4.40** Украінская топ-дваццатка.

## АНТ 23.30 ФІЛЬМ ДНЯ

### «АБРАБАВАННЕ НА БЕЙКЕР-СТРЫТ» (ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ, 2008 г.)

Налёт на банк на Бейкер-Стрыт быў ініцыяваны высокапастаўленымі афіцыйнымі асобамі, якія спрабуюць дабрацца да запаветнай банкаўскай ячэйкі, у якой гаспадыня аднаго з найвядомейшых бардэляў Лондана захоўвала сакрэтную інфармацыю. Цяпер забарона на выдаванне інфармацыі пра гэта рабаванне знятае брытанскім урадам.



**Рэжысёр** — Роджэр Доналдсан. **У ролях:** Джэйсан Стэтхэм, Сафрон Бероўз, Стывен Кэмпбел Мур, Дэніэл Мэйз.

# СУБОТА, 25 ВЕРАСНЯ

## ПЕРШЫ

**6.25** Дак. фільм «Сялянскі гадавы круг».
**7.15** Існасць.
**7.45** Дзень спорту.
**7.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**9.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.05** Здароўе.
**9.35 Камедыя «Паўлінка».**
**10.55** Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2010» (г. Ліда). Цырымонія ўручэння прэмій пераможцам Рэспубліканскага спаборніцтва Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкам.
**12.55** «Жыццё прыгожае пражыць».
**13.10** Канцэрт Надзеі Кадышавай і ансамбля «Залатое кольца».
**14.30** «Еўрабачанне-2010». Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** «Праверка чутак».
**16.40** «Невядомая версія. «Масква слязам не верыць».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зямля беларуская». «Спрадвечная талака».
**19.40** Канцэрт Філіпа Кіркорава.
**21.00** Панарама.
**21.40** Рэспубліканскі фестываль-кірмаш «Дажынкі-2010». Канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі працаўнікам вёскі.
**23.50 Меладрама «Заза».**

## АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**09.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**9.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Людміла Максакава. Дама з характарам».
**12.10** «Саюз».
**12.40 Маст. фільм «Белае сонца пустыні».**
**14.10** «КВЗ». Прэм'ер-ліга. Фінал.
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тур дэ Франс».
**17.15** «Хвіліна славы».
**18.55** «Адзін супраць усіх».
**19.55** «Чакай мяне». Беларусь.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** «Дэтэктар хлусні».
**23.15** «Пражэктарперысхілтан».
**23.55 Маст. фільм «Дзяўчына ў парку».**

## ЛАД

**7.50** «Смачна з Барысам Бурдой».
**8.25** Усё пра бяспеку.
**8.50** Нашы тэсты.
**10.00** Жаночая ліга.
**10.30** «Рэальны свет».
**11.05** Жансавет.
**11.50, 19.55** Тэлебарометр.
**11.55** «Страсці па культуры».
**12.35** Фільм-казка «Горад майстроў».
**14.10** Дак. фільм «Шлях да святла».
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Сіці—Чэлсі.
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) — «Аўтамабіліст» (Екацярынбург).
**19.15** «Восеньскі жарт з...».
**20.00 Баявік «Голдфінгер».**
**22.05** Баскетбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Канада — Беларусь.
**23.45** Жывы гук.

## СТБ

**7.35 Серыял «Вовачка-2».**
**8.30 Маст. фільм «Востраў скарбаў».**
**9.40** «Скардзіцца дазволена».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».**
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.50** «Дарагая перадача».
**14.00 Маст. фільм «Сто дзён пасля дзяцінства».**
**15.45** «Відзьма-нявідзьма».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40 Маст. фільм «Дзве гісторыі пра каханне».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг». Ева Рывас супраць групы «Крамбамбуля».
**21.30 Маст. фільм «Востраў праклятых».**
**0.00 Маст. фільм «Уладар буры».**
**2.10 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».**

## МІР

**5.00, 12.40 Серыял «Камісар Мегрэ».**
**5.50** «Даведнік».
**6.20, 3.50** Дак. фільм «Гіганты Буды».
**7.30** М/с «Тры мядзведзі».
**8.00 Серыял «Прыгоды швейцарскай сям'і Робінсанаў».**
**8.30** «Эксперыментатары».
**8.45** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці.
**9.10** «Сто пытанняў пра Садружнасць».
**9.40** «Мар, дзейнічай, будзь!».
**10.10** «Смачны свет. Узбекская кухня».
**10.40** «Любімыя акцёры».
**11.00** Фільм-казка «Міа, мой міа».
**13.40, 23.35** «Доказы віны».
**14.30** «Саюзнікі».
**15.10, 21.45 Маст. фільм «Гульня».**
**17.00** Простыя лічбы.
**17.35** «Навіны Садружнасці. Культура».
**18.20, 1.00 Маст. фільм «Гарпіі».**
**20.00 Серыял «Лабірынты розуму».**
**21.00** «Асабістыя рэчы з Андрэем Максімавым».
**0.25** «Пра што не прынята гаварыць».
**2.50** «Спецрасследаванне».

## 8 КАНАЛ

**9.00, 9.55, 11.55, 17.55, 18.55, 21.10, 23.50** «Надвор'е».
**9.05** «Пляткарка».
**9.15, 15.00** «Мультпарад».
**9.45** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**10.00 Трылер «Тэкілавае світанне».**
**12.00 Драма «Эдзіт і Марсэль»**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Гром у раі».**
**17.30** «Кінаблакнот».
**18.00 Серыял «Абаронца».**
**19.00 Камедыя «Асабняк з прывідамі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «К-гульні» — «Лайт».
**21.15 Трылер «Прафесіянал».**

## ВТБ

**6.00, 23.30** «PLAY».
**10.30 Серыял «Татавы дочкі».**
**13.00 Серыял «Ранеткі».**
**16.00 Камедыя «Два светы».**
**18.00, 22.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**20.00 Камедыя «Кацiся!».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгена Петрасяна».
**8.50, 23.15 Маст. фільм «Дрэнны добры чалавек».**
**10.25** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**11.00, 14.00, 19.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50 Маст. фільм «Ненаглядны мой».**
**13.30** «Нататкі натураліста».
**14.15** «Яны ваявалі за Радзіму».
**15.05 Маст. фільм «Справа Румянцава».**
**17.00** «Суботні вечар».
**19.40** Дак. фільм «Сакрэтная азбука жыцця. Тайны ДНК».
**20.35 Маст. фільм «Піцерскія канікулы».**
**23.15 Маст. фільм «Кар'ера Дзімы Горына».**
**0.55** «33 вясёлыя літары».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**7.35** «Агляд».
**8.00** Сёння.
**8.20** «Авіятары».
**8.50** «Выратавальнікі».
**9.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15 Меладрама «Па: Сучасная гарадская казка».**
**16.20 Серыял «Злачынства будзе раскрытае».**
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** «Прафесія—рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15 Маст. фільм «Шпількі-2».**

## ТНТ

**5.00** М/с «Сапраўдныя монстры».
**6.00** М/с «Котасабака».
**7.05 Серыял «Лузары».**
**8.00** Клуб былых жонак.
**9.00** Еш і худзей!
**9.30** Школа рамонту.
**10.30** «Cosmopolitan».
**11.30** Дак. фільм «Любоўны трохвугольнік».
**12.30** «Жаночая ліга. Бананавы рай».
**13.00** «Камедзі Клаб».
**14.00 «Універ». Сітком.**
**16.00 Баявік «Тры каралі».**
**18.30, 21.30** «Comedy Батл».
**19.00 Меладрама «Марлі і я».**
**22.00, 1.15** «Дом-2».
**23.30** «Забойная ліга».
**0.40** «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
**2.10 Меладрама «Флірт».**
**4.10 Серыял «Саша + Маша».**
**4.40** «Камедыянты».

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 0.50** Праграма перадач.
**9.10** Біблейскі сюжэт.
**9.40 Маст. фільм «Будуецца мост».**
**11.20** «Асабісты час».
**11.50 Маст. фільм «Пра ката...».**
**12.55** М/ф «Тры таўстуны».
**13.35** «Нататкі натураліста».
**14.05** «Відавочнае—неверагоднае».
**14.35** Гульні класікаў.
**15.35 Маст. фільм «Тры сястры».**
**17.30** «Вялікія раманы XX стагоддзя». Глорыя Свенсон і Джозэф Кенэдзі.
**18.00, 0.55** «Шукальнікі». «Тампліеры ў савецкай Расіі».
**18.45** «Рамантыка рамансa».
**19.40 Маст. фільм «Вівальдзі. Руды святар».**
**21.45** «Каралі песні». Канцэрт Джудзі Гарленд.
**22.55 Маст. фільм «Трыццаць тры».**
**0.10** Дак. фільм «Орсан Уэлс».
**1.40** «Сусветныя скарбы культуры».

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Музычны кіёск». 1988 год.
**5.30** «Клуб падарожнікаў» . 1980 год.
**6.30, 0.25** М/с «Чараўнік Ізумруднага горада».
**6.50, 0.50 «Шафёр на адзін рэйс». Маст. фільм.**
